СЕМІНАР-ПРАКТЫКУМ

“ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭАТРАЛІЗАВАНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РАЗВІЦЦІ МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ”

Мэта:

- актывізаваць дзейнасць педагогаў па авалоданні беларускай мовай;
- садзейнічаць пашырэнню вопыту выкарыстання тэатралізаванай дзейнасці для развіцця маўлення дашкольнікаў;
- папоўніць скарбонку ведаў удзельнікаў семінара практычнымі матэрыяламі

Хатняе заданне:

1. Падрыхтаваць назву каманды і прадстаўленне

2.Падрыхтаваць наглядны матэрыял, дыдактычныя дапаможнікі для работы з дзецьмі па развіцці мовы (1-2 ад кожнай группы)

3. Кожнай камандзе падрыхтаваць міні-сцэнку паводле беларускай казкі.

4. Выстава розных відаў тэатраў па беларускіх народных казках

Родная мова, якой авалодваюць дзеці ў зносінах з дарослымі, з'яўляецца галоўным сродкам засваення імі культуры свайго народа, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Большасць дашкольнікаў у нашай рэспубліцы выхоўваецца ў рускамоўных сем'ях, а яшчэ значная частка ў сем'ях, дзе размаўляюць на так званай "трасянцы" - сумесі беларускай і рускай моў. Гэта прыводзіць да ўзнікнення з'явы інтэрферэнцыі - "засметчанасць" мовы: пранікнення ў рускае маўленне беларусізмаў, а беларускае - русізмаў. Напрыклад, гаворачы па-руску, ужываюць беларускія словы*(сварила бурак)*, граматычныя формы, уласцівыя беларускай мове *(гулять с папам)*, дапускаюць арфаэпічныя і фанетычныя памылкі *(рымень, дзевачка)*. Часта дзеці паралельна ўжываюць агульныя па значэнні словы абедзвюх моў *(кукла і лялька, сапожки і боты, картинка і малюнак, играть і гуляць і інш.)*.

У многіх рэгіёнах, асабліва ў гарадах, дашкольнікі пазбаўлены паўнавартаснага беларускамоўнага асяроддзя, многія выхавальнікі ў дзіцячых садах не валодаюць нацыянальнай мовай.

Даследчыкі дзіцячага маўлення (В. Пенфільд, Л. Робертс і інш.) адзначаюць, што ранні дашкольны ўзрост з’яўляецца найбольш сензітыўным

у развіцці маўлення на другой мове. Аналагічным чынам сцвярджае Н.С. Старжынская: «Далучаць дашкольнікаў да роднага слова неабходна як мага раней – з моманту наведвання дзіцём дашкольнай установы. У гэтым выпадку маўленчыя механізмы, што фарміруюцца ў дзіцяці, “працуюць” не толькі на рускую, але і на беларускую мову і забяспечваюць нацыянальнае бачанне навакольнай рэчаіснасці. Ранняе ўвядзенне беларускай мовы, засваенне якой ідзе не апасродкавана – праз рускую мову, а непасрэдна, садзейнічае фарміраванню моўна-мысліцельнай дзейнасці на беларускай мове»

Для пераважнай большасці рускамоўных дашкольнікаў актыўная практыка маўлення па-беларуску не з’яўляецца жыццёвай неабходнасцю. Ім дастаткова правільна разумець пачутае і назапашваць, “акумуляваць” веды на будучае. Н.С. Старжынская падкрэслівае: “Развіццё беларускага маўлення неабходна ажыццяўляць паступова, пачынаючы з увядзення беларускай мовы ў розныя віды дзейнасці дзяцей ранняга і малодшага дашкольнага ўзросту з мэтай развіцця рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага двухмоўя і яго пачуцця, пераходзячы затым да навучання дашкольнікаў сярэдняга і старэйшага ўзросту прадуктыўнаму беларускаму маўленню. Навучанне на кожным наступным этапе ажыццяўляецца на фоне далейшага развіцця і ўдасканалення маўленчых навыкаў дзяцей, набытых на папярэдніх этапах”

Паколькі адсутнічае граматнае беларускамоўнае асяродзе, у якім нашы дзеці маглі б самастойна засвойваць нормы і правілы маўлення, дарослыя павінны спецыяльна арганізоўваць мэтанакіраванае навучанне дзяцей беларускай мове праз даступныя віды дзіцячай дзейнасці.

Асноўны змест працы педагога па развіццю беларускага маўлення ў дзіцячых садах з рускай мовай выхавання акрэслены ў вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі. Яна базіруецца на пастулаце параўнальна лёгкага засваення дзецьмі другой мовы, сцвярджэнні замежных навукоўцаў, што “мозг дзіцяці мае спецыялізаваную здольнасць да мовы, але яна памяншаецца з узростам” [26, с. 419]. Аўтары праграмы адзначаюць, што дзеці не разумеюць, навошта ім ведаць іншую мову, матывацыя гэтых дзеянняў для іх занадта далёкая і абстрактная. Менавіта таму працэс навучання неабходна арганізаваць па прынцыпу задавальнення асобасных, пазнавальных, гульнёвых патрэбнасцей дзіцяці ў адносінах з дарослымі і іншымі дзецьмі. Спецыяльныя задачы развіцця беларускага маўлення неабходна вырашаць ужо ў *малодшым дашкольным узросце*, калі дзеці вучацца ўспрымаць родную мову і ўзнаўляць на ёй простыя творы (фальклорныя песні, забаўлянкі, казкі, аўтарскія вершы, апавяданні), спіс якіх падаецца ў праграме.

У *сярэднім дашкольным узросце* ў дзяцей пачынаюць фарміраваць пачатковыя навыкі зносін на беларускай мове, а іх маўленчая дзейнасць будуецца на параўнанні рускіх і беларускіх слоў, фраз, выразаў. Акцэнт робіцца на фарміраванні правільнага вымаўлення спецыфічна беларускіх

гукаў [г], [г’], [ў], [ч], [р], звяртаецца ўвага на асобныя арфаэпічныя нормы (аканне, яканне, падаўжэнне і змякчэнне зычных). Пашырэнне і актывізацыя слоўніка дашкольнікаў праводзіцца на аснове іх знаёмства з тэматычнымі групамі слоў, сярод якіх пераважаюць адрозныя ў вымаўленні і найбольш ужывальныя лексічныя адзінкі. Педагогам прапануецца абуджаць цікавасць дзяцей да другой мовы стварэннем гульнявых і праблемных сітуацый, знаёмствам з творамі фальклору: “Выхавальнік заахвочвае маўленне дзяцей на беларускай мове: узнаўленне знаёмых вершаў, забаўлянак, пераказ казак, іх драматызацыя, стварэнне выказванняў, самастойных па задуме і моўным афармленні”. У дзяцей гэтага ўзросту могуць узнікнуць праблемы з блытаннем дзвюх моў, а таксама з самастойным узнаўленнем выказванняў. У гэты перыяд неабходна пачынаць фарміраваць і пачуццё этнічнай прыналежнасці як асновы нацыянальнай самасвядомасці (“я – беларус”). Ажыццявіць гэта магчыма адзіна праз выхаванне пачуцця патрыятызму, гонару за творы нацыянальнай архітэктуры, літаратуры, жывапісу, музыкі і інш.

У *старэйшым дашкольным узросце* акцэнт робіцца на развіцці ў дзяцей звязнага і самастойнага маўлення на беларускай мове, паступова ўскладняюцца асноўныя задачы маўленчага развіцця дзяцей. У гэтым узросце працягваецца замацаванне вымаўлення беларускіх гукаў [г], [г’], [ў], [дж], [ч], [р], фарміруецца правільнае вымаўленне спецыфічных гукаў і спалучэнняў [шч], [ц’], [дз’], адпрацоўваюцца ўжо вядомыя нормы беларускай арфаэпіі. Старэйшыя дашкольнікі знаёмяцца з новымі беларускімі словамі, супастаўляюць міжмоўныя амонімы (*диван – дыван, неделя – нядзеля*), падобныя па гучанню лексічныя адзінкі (*зверёк – звярок, гусь – гусь, ночь – ноч*). Педагог вучыць выхаванцаў выкарыстоўваць розныя граматычныя формы і канструкцыі ў залежнасці ад камунікатыўных задач, асабліва акцэнтуючы ўвагу на моўных структурах адрозных ад рускіх.

Адным з лепшых спосабаў развіцця мовы і мыслення дзяцей зяўляецца тэатралізаваная дзейнасць, якая дастаўляе дзіцяці задавальненне і радасць, а гэтыя пачуцці з'яўляюцца наймацнейшым сродкам, стымулюючым актыўнае ўспрыманне мовы і параджаюць самастойную маўленчую дзейнасць. Усе арганізаваныя гульні, у тым ліку і пальчыкавыя, якія суправаджаюцца мовай, ператвараюцца ў своеасаблівыя маленькія спектаклі, якія захапляюць дзяцей і прыносяць ім шмат карысці.

У сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму гульня-драматызацыя аказаве актывізуючы уплыў на развіццё беларускага маўлення, паколькі яна спалучае разам гульнявую матывацыю і камунікатыўную накіраванасць. Менавіта у гульні-драматызацыі дашкольнікі маюць магчымасць спалучать рэпрадуктыўнае маўленне (перадача літаратурнага тэксту) і прадуктыўнае (асабіста актыўнае маўленне).

У дашкольнай установе гульні-драматызацыі праводзяцца па зместу казак, апавяданняў і сюжэтных вершаў у розных узроставых групах.У малодшых і сярэдніх групах дзяцей вучаць драматызацыі на занятках па азнаямленню з творамі мастацкай літаратуры. У старэйшай групе

гульні-драматызацыі праводзяцца ў час самастойнай мастацка-маўленчай дзейнасці дзяцей, звычайна у другую палову дня.

Поспех гульні-драматызацыі залежыць ад правільнага выбару літаратурнага твора выхавальнікам. Мастацкія творы для драматызацыі павінны адпавядаць патрабаванням:

- дзянні герояў павінны быць цікавымі дзецям;
- учынкі герояў – павучальнымі;
- сітуацыі – канфліктныя;
- у творы маюўь месца і дыялогі і маналогі дзеючых асоб;
- твор просты і дынамічны.

Дзеці больш за ўсё любяць драматызаваць казкі. У большай ступені пералічаным вышэй патрабаванням адпавядаюць казкі “Пшанічны каласок”, “Дзедава рукавічка”, “зайкава затка”, “Коцік,пеўнік і лісіца”.

У малодшых і сярэдніх групах для драматызацыі выкарыстоўваюцца беларускія народныя забаўлянкі, вершы беларускіх паэтаў, казкі, апавяданні (“Бусел і хлопчык” А. Дзеружынскага, “Ласачка”, “Хто сказаў “мяў” В. Суцеева і інш.)

Каб пераўтварыць звычайную казку ў інсцэніроўку, трэба выканаць некалькі паэтапных аперацый, прайсці праз усе адпаведныя гэтаму працэсу стадыі:

1. знаёмства з творам і яго аўтарам
2. чытанне тэксту выхавальнікам (перад чытаннем даюцца заданні: запомніць герояў казкі, месца дзеянне і падзеі, апісаныя ў ёй);
3. пераказ твора
4. работа над тэкстам : а) фантазіраванне па твору; б) падзел казкі на сцэны – падзеі; в) чытанне па ролях; г) засваенне тэксту;
5. абмеркаванне і размеркаванне роляў (выбар дзеючых асоб, улічваюцца здольнасці і схільнасці выканаўцаў, а яшчэ характар, тэмперамент дзіцяці, яго рост, камплекцыя, манера гаварыць);
6. пошукі мастацкай выразнасці (выяўленчай, музычнай, пластычнай) кожнай сцэны, кожнага героя;
7. выбар касцюмаў і дэкарацый

Акрамя гульняў драматызацыі ў дзіцячым садзе праводзіцца яшчэ і інсцэнізацыя мастацкіх твораў, якая ўяўляе сабой дакладнае і паслядоўнае адлюстраванне аўтарскага літаратурнага тэксту.

У адрозненні ад гульні-драматызацыі інсцэніраванне патрабуе спецыяльнага завучвання тэксту. Яго праводзяць толькі з дзецьмі старэйшага ўзросту, звычайна у час правядзення ранішнікаў, канцэртаў, святаў. Пры інсцэніраванні літаратурных твораў абавязкова выкарыстоўваць дэкарацыі, атрыбуты, касцюмы.

У інсцэнізацыі, як правіла, ёсць вядучыя, якія вымаўляюць словы аўтара. Унсцэніраваць можна і вершаваня творы, некаторыя вершаваныя жандры вуснай народнай творчасці.

ПРАКТЫЧНАЯ ЧАСТКА

Заданне 1. Прадстаўленне каманд. (*Назвы каманд, удзельнікаў і капітана прадстаўляюць самі ўдзельнікі.)*

Вядучы (В.). Кожнай камандзе неабходна было прыдумаць назву сваёй камандзе і падрыхтаваць невялікае прадстаўленне

Заданне 2. «Адкажы на пытанне».

1 каманда: Пералічыце задачы па развіцці мовы дзяцей дашкольнага ўзросту.

Адказ: слоўнікавая работа (разумець і называць словы), гукавая культура маўлення, фарміраванне граматычнага ладу маўлення, развіццё звязнага маўлення і маўленчых зносін.

2 каманда: Што мы разумеем пад развіццём мовы дзіцяці?

Адказ: развіццё мовы — гэта творчы працэс, які фарміруецца ў выніку ўспрымання мовы дарослых, асабістай моўнай актыўнасці і элементарнага ўсведамлення з'яў языка і мовы.

1 каманда: Назавіце задачы слоўнікавай работы.

Адказ: пашырэнне, узбагачэнне, актывізацыя слоўнікавага запасу дзяцей.

2 каманда: Што ўключае ў сябе работа па фарміраванні граматычнага ладу маўлення дашкольнікаў?

Адказ: работу над марфалогіяй (змяненне па родзе, ліку, склоне), лексікай (утварэнне аднаго слова на базе іншага), сінтаксісам (будова простых і складаных сказаў).

1 каманда: Што такое дыялог?

Адказ: дыялог — гэта размо-ва дзвюх або некалькіх асоб на тэму, звязаную з якой-небудзь сітуацыяй.

2 каманда: Што такое маналог?

Адказ: маналог — гэта маўленне адной асобы, якое накіравана да слухачоў.

Заданне 3. Гульня - віктарына «Пазнай твор, назаві аўтара»

1 каманда. Горкай, горкай, горачкай

Ушоў малы Ягорачка.
Ваўкоў не баяўся,
Страхаў не пужаўся *(бел. нар. забаўянка)*

2 каманда. - Ласачка, дзе была?
- Працавала давідна.
- Што рабіла?
- Кросны ткала. *(бел. нар. забаўянка)*

1 каманда. Наўкол кветкі цвітуць, жвавыя конікі скачуць, У небе птушачкі спяваюць. Задумалася Муха: як жа добра на свеце жыць*? (Беларуская народная казка "Пчала і муха")*

2 каманда. Настаў вечар. Сокал паляцеў на ржышча начаваць. Сеў на каменні ды моцка заснуў. А Верабей пашчабятаў ад радасці і палез пад страху. (*Беларуская народная казка "Верабей і мыш")*

1 каманда. Вестку паслалі старэйшаму сыну,
Той адразу усе справы пакінуў
І праведаць хворую маці прыехаў,
І прывёз ёй поўны мех арэхаў.
(В. Вітка "Вавёрчына гора")

2 каманда. Каля ёлкі карагоды
Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі у вусны смех пускае
(Я.Колас "Дзед-госць")

Заданне 4. Гульня «Пытанне – адказ».

Каманды вымаўляюць тэкст розным па вышыні голасам. Пытанні задаюцца высокім голасам, адказы вымаўляюцца нізкім.
Пытанні – каманда 2
Адказы – каманда 1

— Ну, Вясна, як справы? *(высока)*

— У мяне ўборка. *(нізка)*

— Для чаго табе венік? *(высока)*

— Снег месці з пагорка. *(нізка)*

— Быў гарбар? *(высока)*

— Быў. *(нізка)*

— Шыў боцікі? *(высока)*

— Шыў. *(нізка)*

— Для каго боцікі? *(высока)*

— Для пухнатай коценькі. *(нізка)*

Заданне 5. Хатняе заданне . Кожная каманда прэзентуе выраблены дапаможнік, тлумачыць, дзе і як ён можа выкарыстоўвацца, для якога ўзросту.

Заданне 6. «У госці да казкі» (інсцэніроўка).

Кожная каманда паказвае міні - сцэнку паводле беларускай казкі.

Такім чынам, можна падвесці вынік: каб навучыць дзяцей размаўляць па-беларуску, недастаткова толькі знаёміць іх з творамі на роднай мове, патрэбна стварыць умовы для яе развіцця. Вялікая роля тут належыць выхавальніку. Пры паўтарэнні за выхавацелем слоў, сказаў, пераказ і драматызацыя твораў, завучванне на памяць дазваляе дзецям не толькі запамінаць іх, але і практыкаваць ў правільным вымаўленні гукаў і слоў, замацоўваюць артыкуляцыйны апарат.

Чым раней дзеці “пагружаюцца” у моўнае асяроддзе, тым лепей і хутчэй развіваецца іх звязнае маўленне.

ЛІТАРАТУРА:

1. Старжынская, Н.С. Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. — Мазыр: Белы Вецер, 2008.

2. Лабанава, Г. Крынічнай вадой беларускія словы бруяць / Г. Лабанава // Пралеска. — 2011. — № 1. — С. 4—9.

3. Окаркава, С. Калыханкі матулі / С. Окаркава // Пралеска. — 2011. — № 2. — С. 18—23.

4. Някрасава, Н. Дзеці і мір казак / Н. Някрасава, Р. Маісеенка. — Мінск: Зорны верасень, 2006.

5. Дубініна Дз.М., Стражынская Н.С. мастацка-маўленчая дзейнасць ў дзіцячым садзе / Дз.М., Дубініна, Н.С. Стражынская. – Мн.: Нар. асвета, 1999.